ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 9 (533) | Субота, 19 сакавіка 1983 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

# СХОД АКТЫВУ

На мінулым тыдні ў актавай зале універсітэта адбыўся сход камсамольска-прафсаюзнага актыву ГДУ. У ім прынялі ўдзел члены камітэта камсамола, прафкома студэнтаў, камсамольскіх і прафсаюзных бюро факультэтаў, курсаў, груп, куратары.

З дакладам «Аб умацаванні камсамольскай, вучэбнай, працоўнай і прававой дысцыпліны сярод камсамольцаў універсітэта ў святле патрабаванняў лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС» на сходзе выступіў сакратар камітэта камсамола ГДУ **С. У. Аўсеенка.**

У спрэчках па дакладу прынялі ўдзел ленінскі стыпендыят, студэнт біялагічнага факультэта **С. Рыдвы**; праформ групы Г-31 гісторыка-філалагічнага факультэта **І. Градзюшка**; прарэктар па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР **Л. А. Шамяткоў**; сакратар камсамольскага бюро выкладчыкаў і супрацоўнікаў матэматычнага факультэта **Г. Карасёва**; сакратар камсамольскага бюро геалагічнага факультэта **М. Анціпчук**; старшыня прафкома студэнтаў **Н. І. Колтышава**; сакратар камсамольскага бюро падрыхтоўчага аддзялення **Л. Шаўцова**; старшыня Савета па рабоце ў інтэрнатах пры парткоме ГДУ дацэнт **Л. Н. Сечка**; член прафкома, старшыня культурна-масавай камісіі студэнтка 2-га курса гістфіла **Т. Даўгун.**

Па абмеркаванаму пытанню сход прыняў разгорнутую пастанову, накіраваную на ўхіленне меўшых месца недахопаў і далейшае паляпшэнне работы па падбору, расстаноўцы і выхаванню кадраў камсамольскага і прафсаюзнага актыву, павышэнне якаснага ўзроўню выхаваўчай работы.

# ЗВАННЕ КАМСАМОЛЬЦА АБАВЯЗВАЕ

## (З даклада сакратара камітэта ЛКСМБ С. У. Аўсеенкі)

Дакладчык адзначыў, што ў добрасумленных адносінах кожнага грамадзяніна нашай краіны да выканання сваіх абавязкаў праяўляецца класавая, палітычная сталасць савецкага чалавека. Таму меры, якія прымаюцца па ўмацаванню дысцыпліны і арганізаванасці, знаходзяць гарачае адабрэнне працоўных, моладзі краіны.

Сярод камсамольцаў універсітэта нямала ёсць такіх студэнтаў, з якіх астатнім трэба браць прыклад, раўняцца на іх. Гэта выдатнікі вучобы, ленінскія і імянныя стыпендыяты, камсамольскія актывісты А. Гайдукова, Г. Байкачоў, Н. Кандратава, М. Сергіенка, Н. Федарцова, С. Рыдны, І. Афанасьеў, В. Малашанка. Павышэнню актыўнасці камсамольцаў ГДУ садзейнічалі прынятыя факультэцкімі камсамольскімі арганізацыямі сацыялістычныя абавязацельствы па выкананню рашэнняў XXVI з'езда КПСС, XIX з'езда ВЛКСМ і па дастойнай сустрэчы 60-годдзя ўтварэння СССР. Большасць вучэбных груп прыняла ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве за права называцца лепшай ва універсітэце. Правафланговымі ў мінулым навучальным годзе сталі групы Г-51 гістфіла, 0-41 эканомфака і Б-32 біялагічнага факультэта.

Аднак, калі гаварыць аб паспяховасці студэнтаў універсітэта, працягваў далей С. У. Аўсеенка, узровень яе нас не можа задаволіць. Калі параўнаць вынікі мінулагодняй зімовай сесіі з сёлетняй, дык становіцца бачна, як працэнт паспяховасці падае ўніз. Зменшылася колькасць выдатнікаў на 10 працэнтаў., а непаспяваючых студэнтаў стала больш прыкладна на 40 працэнтаў. Значыць, не эфектыўныя тыя меры, якія прымяняюць камсамольскія бюро, вучэбна-выхаваўчыя камісіі факультэтаў да студэнтаў, якія маюць запазычанасці па многіх прадметах, лічаць вучобу не сваім галоўным абавязкам, а нейкай другараднай справай. Выконваючы патрабаванні XIX з'езда ВЛКСМ, рашэнні лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС, камсамольскія бюро павінны настойліва і мэтанакіравана дабівацца стварэння ў кожным студэнцкім калектыве такой маральнай абстаноўкі, у якой лянота, гультайства і расхлябанасць атрымалі б суровае асуджэнне і рашучы адпор.

Прывіць будучаму спецыялісту такія якасці, як арганізаванасць і дзелавітасць — адказная задача вышэйшай школы і вузаўскага камсамола, — сказаў дакладчык.

Высокае званне камсамольца патрабуе ад кожнага студэнта быць прыкладам у выкананні свайго абавязку, не праходзіць міма недахопаў, настойліва змагацца з тым, што перашкаджае нам жыць. На жаль, нярэдкія яшчэ выпадкі, калі члены ВЛКСМ не даражаць гонарам савецкага студэнта. Толькі за мінулы навучальны год камітэтам камсамола разгледжана 39 персанальных спраў членаў ВЛКСМ. За амаральныя паводзіны, парушэнне Статута ВЛКСМ, вучэбнай і працоўнай дысцыпліны яны атрымалі строгія вымовы з занясеннем ва ўчотную картку, некаторыя выключаны з радоў ВЛКСМ. Гэтыя факты наводзяць на трывожны роздум.

Па-ранейшаму востра стаіць праблема нашых інтэрнатаў, сказаў далей С. У. Аўсеенка. Менавіта на іх прыпадае асноўная частка ўсіх правапарушэнняў. Таму камітэту камсамола неабходна актывізаваць грамадскую думку вакол парушальнікаў дысцыпліны.

За апошнія гады ў практыку работы многіх навучальных устаноў укаранёны перспектыўныя комплексныя планы, якія разлічаны на ўвесь перыяд навучання. Аднак гэтыя планы ў нейкай меры працуюць фармальна, у тым ліку і ў нашым універсітэце. Асноўнымі дзеючымі асобамі ў гэтых планах выступаюць рэктарат, дэканаты, кафедры, партыйныя бюро. А вось роля самога студэнцкага калектыву недаацэньваецца. Як правіла, актывісты, камсоргі не нясуць адказнасці за рэальнае становішча спраў ў калектыве. І галоўная «выхаваўчая ячэйка» — акадэмічная група застаецца часам у ролі назіральніка. Відавочна, што ў такім выглядзе планы выхавання абмяжоўваюць ініцыятыву моладзі. З мэтай узмацнення ролі пярвічных камсамольскіх арганізацый груп, студэнцкіх калектываў у выхаванні студэнтаў, сказаў дакладчык, камітэт камсамола універсітэта распрацаваў сістэму мер, якія будуць садзейнічаць павышэнню якаснага ўзроўню выхаваўчай работы. Яны дазволяць узняць на больш якасны ўзровень і правядзенне грамадска-палітычнай атэстацыі. Сярод іх: палітычны залік, як форма арганізацыі палітычнай вучобы студэнтаў, удасканальванне важнай састаўной часткі Ленінскага заліку — грамадска-палітычнай практыкі, увядзенне дыферанцыраванай адзнакі па выніках ГПП, выданне дзённікаў камсамольскай групы з мэтай павышэння якасці і аператыўнасці кантролю за работай пярвічнай арганізацыі. Да гэтых мер адносіцца ўзмацненне індывідуальнай работы — заслухоўванне членаў ВЛКСМ на камсамольскіх сходах аб выкананні імі статутных патрабаванняў, вывучэнне і ўкараненне вопыту лепшых камсамольскіх арганізацый ВНУ краіны па прыцягненню студэнцкай моладзі да аховы грамадскага парадку, актывізацыя работы пастоў «Камсамольскага пражэктара», прэс-цэнтраў на барацьбу за ахову сацыялістычнай маёмасці, парадку ў вучэбных карпусах, аўдыторыях, інтэрнатах і інш.

Наперадзе ў нас вялікая і шматгранная работа, сказаў у заключэнне дакладчык. Вынікі яе будуць залежыць ад таго, як кожны з камсамольскіх актывістаў справіцца з даручаным участкам работы. Поспех яе — у прамой залежнасці ад арганізаванасці і самааддачы кожнага з нас.



**НА ЗДЫМКУ: рэктар ГДУ акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць уручае ганаровы дыплом Мінвуза БССР, Белсаўпрофа і Белсавета СДСТ «Буравеснік» куратару групы ФВ-21 факультэта фізічнага выхавання В. М. Адзінцову, якая прызнана пераможцам рэспубліканскага агляду-конкурсу на лепшую пастаноўку спартыўнай работы ў гонар 60-годдзя СССР.**

*Правафланговая група*

# СКЛАДАЕМЫЯ ПОСПЕХУ

**По выніках І этапа агляду-конкурсу на лепшую акадэмічную групу універсітэта другое месца заняла група Т-42 эканамічнага факультэта. Пра яе гэты расказ.**

Пра людзей, якіх добра ведаеш, гаварыць і лёгка, і цяжка. Лёгка таму, што вучышся з імі ўжо чацвёрты год, бачыш кожны дзень на занятках. А цяжка таму, што мае словы аб іх могуць здацца суб'ектыўнымі.

Год 1979 стаў пачаткам «біяграфіі» нашай групы. Цяпер нельга без усмешкі ўспамінаць той час, калі для нас, нясмелых першакурснікаў, усё было новым і незвычайным. Вось тады на дапамогу нам прыйшла Тамара Дзмітрыеўна Трацэўская — наш куратар. Яна гаварыла нам, што для нас самае галоўнае — як мага раней выявіць свае здольнасці, таму што каб дасягнуць поспеху, адной захопленасці мала. Неабходна паўсядзённая праца. Таму так важна было перш за ўсё выхаваць у сабе пачуццё мэты, дысцыпліну, самаарганізаванасць.

У тоне Тамары Дзмітрыеўны мы не пачулі той паблажлівасці старэйшага, умудранага жыццёвым вопытам чалавека, якім настаўлялі нас выкладчыкі ў школе. Менавіта гэта выклікала ў нас пачуццё давер'я да куратара. Святочны настрой першых студэнцкіх дзён прайшоў і пачаліся будні з іх канспектамі, семінарамі, кантрольнымі.

Галоўная справа студэнта — вучоба. Вы скажаце, гэта аксіёма. Студэнты ўпаўне дарослыя людзі і самі разумеюць, што веды, атрыманыя імі ва універсітэце, — іх жыццёвы патэнцыял. Але разуменне гэтага прыйшло да нас не адразу. Спачатку былі і зрывы. Адчувалася адсутнасць вопыту сістэматычнай самастойнай работы, няўменне рацыянальна планаваць свой час, а ў некаторых выпадках — адсутнасць зацікаўленасці ў вучобе.

Але цяжкасці загартоўвалі нас і ў пераадоленні іх паступова складваўся характар групы, гонарам якой сталі нашы выдатнікі Г. Кабанчук, Л. Дзянісава, А. Чапурной, А. Ляхаў, М. Булаўкін. Заявілі аб сабе і нашы рабяты А. Кузьменка, Т. Сукава, А. Ткач, А. Борсук, Н. Грышаева, якія сталі актыўна займацца грамадскай работай. Але простае дзяленне нашых студэнтаў на выдатнікаў і грамадскіх дзеячаў — няправільнае. Таму што, напрыклад, Галіна Кабанчук выдатна вучыцца і ў той жа час рэдагуе факультэцкую насценную газету «Эканаміст». Аляксандр Ляхаў — член камітэта камсамола універсітэта, Міхаіл Булаўкін з'яўляецца старастай групы.

Асабліва цёплыя словы хочацца сказаць пра нашых камуністаў: Наташу Старавойтаву, Аню Шэлдукову, Сашу Борсука. Гэта людзі — узор высокай адказнасці і патрабавальнасці да сябе. Наташа — кандыдат у члены гаркома партыі, Аня — старшыня Добрушскага занальнага штаба СБА. Яны — наш гонар, з іх мы бярэм прыклад.

Гаварыць толькі аб вучобе рабят, іх актыўным удзеле ў грамадскім жыцці факультэта, універсітэта, значыць, даць няпоўны партрэт нашай групы Т-42. Мы не зубрылы і не сухары, для якіх культ добрай адзнакі адводзіць на іншы план усё астатняе. Мы моцна сябруем і па-за сценамі аўдыторый універсітэта: ходзім разам у тэатр, цырк, адпачываем на ўлонні прыроды, у студэнцкім інтэрнаце.

**Так мы жывём, так вучымся. І вельмі радасна ўсведамляць сябе часцінкай дружнага, згуртаванага калектыву, імя якому — група Т-42, маленькая, але моцная ячэйка нашай ВНУ.**

**Л. ЦІМОХАВА,**
**камсорг групы Т-42.**

# КОНКУРС ПАЛІТЫЧНАГА ПЛАКАТА

Няма нічога даражэй на свеце, чым мір. Зберагчы яго, не даць разгарэцца пажару ядзернай вайны — клопат усіх прагрэсіўных сіл планеты. Свой уклад у барацьбу за мір уносіць і савецкая моладзь.

Нядаўна Цэнтральны райком камсамола правёў конкурс палітычнага плаката «Моладзь у барацьбе за мір», у якім прынялі ўдзел юнакі і дзяўчаты прамысловых прадпрыемстваў, устаноў, студэнты нашага універсітэта, навучэнцы тэхнікумаў, школьнікі Цэнтральнага раёна г. Гомеля.

У Палацы культуры мясцовай прамысловасці былі прадстаўлены сотні плакатаў, аб'яднаных адной тэмай — барацьбы за мір. Журы конкурсу цяжка было адразу назваць лепшыя работы, таму што аўтары-выканаўцы палітычных плакатаў кожны па-свойму і арыгінальна змаглі з дапамогай пэндзля або алоўка выказаць і данесці галоўную думку.

Сярод шматлікіх лаўрэатаў конкурсу і студэнты групы Ф-12 фізічнага факультэта. Іх плакат «Калакалы Хатыні» заняў другое месца. Аўтары ўзнагароджаны Ганаровай граматай Цэнтральнага райкома ЛКСМБ і памятнымі сувенірамі.

**В. ШЭВЕЛЕВА,**
**нам. сакратара камітэта камсамола ГДУ па ідэалагічнай рабоце.**

